КРАЕВЕДЧЕСКИЙ КЕЙС СОЛИГОРСКА

# Канцэрт быў захапляючым

Прыезд артыстаў Дзяржаўнай філармоніі Грузіі быў для беларускіх гарнякоў прыемным сюрпрызам.

Яшчэ задоўга да пачатку выступлення зала шырокаэкраннага кінатэатра была перапоўнена. З першых мінут канцэрта паміж слухачамі і выканаўцамі ўстанавіліся цёплыя, сяброўскія адносіны. Ролю гасціннага гаспадара вечара ўзяў на сябе канферанс'е Юрый Мар'янко, разумныя і трапныя жарты якога выклікалі ў прысутных дружны смех.

З захапленнем глядзіш абхазскія горныя танцы ў выкананні Н. Тваўры, О. Перадзе і Г. Андгупадзе, чаруюць мелодыі грузінскіх песень, якія выконвае вакальны дуэт у складзе Датуашвілі і Чыхладзе. А калі на сцэне з'явілася народная артыстка Грузіі Ольга Далідзе — выканаўца сатырычных вобразаў, фельетонаў, нават самыя хмурыя людзі не ўтрымаліся ад смеху.

Доўга, незмаўкаючча апладзіравала зала заслужанаму артысту Грузінскай ССР Эдышэру Мірыманашвілі. Яго голас, майстэрскае выкананне неапалітанскіх песень, песень савецкіх кампазітараў, арый з опер заварожвае слухачоў. Гледачы зноў і зноў просяць яго паўтарыць той або іншы твор.

Многа прыемных мінут даставілі жыхарам маладога горада спявачка Бабаева і імітатар музычных інструментаў В. Мірыманашвілі.

Цудоўна, захапляюча! — вось што можна сказаць аб гэтым канцэрце.

**М. РАК,**
**аграном калгаса «Прамень намуны» Старобінскага раёна.**